Святлана МАЖАРОЎСКАЯ

## Першы анёл

За адзін дзень да нараджэння
Дзіцятка Госпада пытае:
– Навошта я ў свет прыходжу
І што мяне ў ім чакае?

– Я ткаў цябе адной любоўю
І даў табе, што сам Я маю.
Нясці сумленна Вобраз Мой,
Дзіцятка, Я табе жадаю.

Яшчэ Я дам табе Анёла.
Адкажа ён на ўсе пытанні.
Заўседы будзе ён з табою:
І ўвечары, і на світанні.

Ад любой бяды закрые
Сваімі крыламі цябе,
А цень ад самай чорнай хмары
Сваёй любоўю адвядзе.

– А як завуць майго Анёла? –
Пытанне ціха прагучала.
– Імён ёсць многа ў яго,
Ты называй жа проста – МАМА.

